5. Мировой посредник. – 26.02.1862 г. – № 4.
6. Мировой посредник. – 12.03.1862 г. – № 5.
7. Мировой посредник. – 1862. – № 10.
8. *Неелова, М. Г.* К истории Института Мировых посредников (на примере Олонецкой губернии) / М. Г. Не-елова // Музей Кижи [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://kizhi.karelia.ru/library/vestnik-9/314.html. – Дата доступа: 10.05.2018.
9. *Никулин, В. Н.* Помещики Северо-Запада России во второй половине XIX – начале XX века / В. Н. Нику-лин. – Калининград: Изд-во РГУ им. И. Канта, 2005. – 340 с.
10. Национальный исторический архив Беларуси в г. Минск (далее – НИАБ в Минске) – Ф. 2219. – Оп. 1. – Д. 6. О бумагах, принятых к сведению руководству и исполнению (1862–1863 гг.)
11. Полное собрание законов Российской империи. Собрание третье: в 33 т. – СПб.: Тип. II Отд. Собств. Е. И. В. Канцелярии, 1905. – Т. XXIII. Отд. 1: 1903. № 22360–23838.
12. *Пяткевіч, Ч.* Грамадская культура Рэчыцкага Палесся / Ч. Пяткевіч. – Мінск: Беларус. навука, 2015. – 319 с.
13. НИАБ в г. Гродно. – Ф. 51. – Оп. 1. – Д. 4. Циркуляры Гродненского губернатора, губернского по кре-стьянским делам присутствия о выдаче штемпелей для сельских волостных правлений и др.
14. *Чернуха, В. Г.* Крестьянский вопрос в правительственной политике России (60–70-е гг. XIX в.) / В. Г. Чер-нуха. – Ленинград: Наука, 1972. – 224 с.

**Дата поступления: 10.10.2018.**

*Талмачова С. А.*
Беларускі дзяржауны педагагічны універсітэт імя М. Танка, Мінск

*Talmachova S.*
Belarusian State Pedagogical University named after M. Tank, Minsk

**УДК 94(476):[352:63]“1906/1914”**

# РОЛЯ МЯСЦОВЫХ ОРГАНАЎ КІРАВАННЯ Ў РЭАЛІЗАЦЫІ СТАЛЫПІНСКАЙ АГРАРНАЙ РЭФОРМЫ Ў БЕЛАРУСІ (1906–1914 ГАДЫ)

# THE ROLE OF LOCAL ADMINISTRATIVE BODIES IN REALIZATION OF STOLYPIN AGRARIAN REFORM (1906–1914)

*Сталыпінская рэформа паклала пачатак новаму этапу ў аграрнай палітыцы урада Расійскай імперыі. Акрамя губернскіх і павятовых землеўладкавальных камісій, мясцовыя органы кіравання – губернскія прысутнасці, земскія начальнікі і іх павятовыя з'езды – адыгрывалі значную ролю ў рэалізацыі сталыпінскай рэформы. Земскія начальнікі не толькі былі першай інстанцыяй па падрыхтоўцы дакументальнага суправаджэння, але і непасрэдна удзельнічалі ў землеўладкаванні. Іх павятовыя з'езды і губернскія прысутнасці ажыццяўлялі кіраўніцтва і кантроль. Ад таго, наколькі своечасова і дакладна мясцовыя органы інфармавалі насельніцтва, тлумачылі сэнс заканадаўчых актаў і цыркуляраў, залежала актыўнасць сялян у набыцці зямлі, пераходзе да хутароў і адрубоў, укараненні новых спосабаў вядзення гаспадаркі.*

*Ключавыя словы: Беларусь; Сталыпінская аграрная рэформа; мясцовае кіраванне; земскі начальнік; губернская прысутнасць; землеўладкавальныя камісіі; сялянства; пазямельнае ўладкаванне.*

*Stolypin reform was the beginning of a new stage in agrarian policy of government of the Russian Empire. Except for provincial and district land-arranging committees, the local administration bodies - governorship offices, zemstvo heads and their district congresses – played a significant role in realization of the Stolypin reform. Zemstvo heads were not only the forest instance of preparing the documental maintenance but also they took direct part in land arrangement. Their district congresses and governorship offices carried out the management and control. The timely and accurate information of the population and explanation of the sense of legislative acts and circulars by the local bodies influenced the activity of peasants in acquiring the land, switching to homesteads and land cuts off and rooting new ways of housekeeping.*

*Keywords: Belarus; Stolypin agrarian reform; local administration; zemstvo head; governorship office; land arranging committees; peasantry; land arrangement.*

Сталыпінская рэформа паклала пачатак новаму этапу ў аграрнай палітыцы урада Расійскай імперыі. Мэтай рэформы было стварэнне шырокага слоя заможных гаспадароў, якія сталі моцнай апорай і рухаючай сілай сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Ход і вынікі яе рэалі

ып прыцягвалі увагу публіцыстаў, гісторыкаў, цыёлагаў, эканамістаў і інш. Аднак роля мясвых органаў кіравання (губернскіх прысутнаей, земскіх начальнікаў і іх павятовых з'ездаў) этым працэсе не стала прадметам спецыяльнадаследавання.

Сталыпінская аграрная рэформа пачалася ыдання указа ад 9 лістапада 1906 г., якім абшчалася права выхаду сялян з абшчыны і умавання зямлі ў асабістую уласнасць. Раней, 4 савіка 1906 г., дзеля палягчэння набыцця сялянамі млі пры дапамозе Сялянскага пазямельнага нка ствараліся павятовыя і губернскія земуладкавальныя камісіі [1, с. 199–201]. Акрамя го, на камісіі ўскладаўся абавязак садзейнічанасельніцтву «к устранению в установленном коном порядке недостатков существующего млевладения и землепользования <…> при неіеменном сохранении законных прав частных іадельцев» [1, с. 199]. Асноўная ўвага ў гэтым прамку была накіравана на дакументальнае зацаванне за сялянамі тых зямельных надзелаў, ія знаходзіліся ў іх карыстанні, на ліквідацыю распалосіцы і сервітутаў, што значна перашджала развіццю і прыбытковасці як памешчыцй, так і сялянскай гаспадаркі і інш. У склад гурнскіх камісіі ўвайшлі прадстаўнікі мясцовага равання – неадменныя члены губернскіх прытнасцей, у склад павятовых – земскія началькі, таму што па сваіх прамых абавязках гэтыя ыноўнікі павінны былі ведаць геаграфічныя і эмаграфічныя асаблівасці мясцовасці і галоўныя раблемы пазямельных адносін жыхароў. Пры тым Л. П. Ліпінскі і А. Р. Бухавец сцвярджаць, што «толькі ў Гродне губернская землеўпаадкавальная камісія створана не была; яе функы выконвала губернская па сялянскіх справах станова» [2, с. 372]. Аднак да выдання закона д 29 мая 1911 г. губернскія прысутнасці выконалі функцыі губернскіх землеўпарадкавальных амісій не толькі ў Гродзенскай, але і ў Віленскай уб. [3, с. 25; 4, с. 11]. Удзел земскіх начальнікаў дзейнасці землеўладкавальных камісій даваў ім агчымасць уплываць на рашэнні гэтых органаў, рапанаваць, якія хадайніцтвы заслугоўваюць заавальнення ў першую чаргу.

Для вырашэння пытання аб выдачы пазыкі д Сялянскага банка неабходна было падрыхтаваць шэраг дакументаў. Пры гэтым на першым тапе галоўная задача ўскладалася на земскага ачальніка, які «збіраў звесткі» і перадаваў іх а сваім заключэннем на разгляд спецыяльнай амісіі, а яна вырашала пытанне па хадайніцтву. / статыстычных даных адлюстраваны толькі ыя здзелкі, якія завяршыліся набыццём зямлі. Пры гэтым частка з іх па розных прычынах «расстроилась». У прыватнасці, у 1913 г. у Мінскае аддзяленне Сялянскага пазямельнага банка было прадстаўлена 530 пагадненняў з 553 гаспадарамі двароў на набыццё 8422,1 дзес. банкаўскай зямлі з выдачай грашовай пазыкі банкам і 17 – на набыццё 159,2 дзес. без пазыкі. Саветам банка, упаўнаважаным і аддзяленнем банка была дазволена пазыка па 514 здзелках 547 гаспадарам двароў з пазыкай і па 14 здзелках – на 148,4 дзес. зямлі без яе. Адхіленых пагадненняў па набыцці банкаўскай зямлі не было. Пры гэтым яшчэ да разгляду банкам па розных прычынах «расстроились» 33 здзелкі па набыцці 33 гаспадарамі 650,6 дзес. зямлі з банкаўскай пазыкай, і 7 здзелак з 118 гаспадарамі двароў па куплі 1845,9 дзес. за кошт уласных сродкаў. Аднак ужо пасля дазволу банкам пазыкі 49 здзелак на 1145,5 дзес. зямлі «расстроились» [5, с. 67–68]. Такім чынам, прадстаўляецца праблематычным дакладна ў лічбах вызначыць аб'ём папярэдняй работы мясцовых органаў па падрыхтоўцы дакументаў па хадайніцтвах сялян на набыццё зямлі праз Сялянскі пазямельны банк, але можна сцвярджаць, што ён быў значным.

Пры дапамозе Сялянскага пазямельнага банка да чэрвеня 1914 г. толькі ў 1-м участку Слуцкага павета Мінскай губ. сяляне Слуцкай воласці набылі 1219 дзес. ў прыватнае валоданне, у Грэскай воласці пакупшчыкі аб'ядналіся ў таварыствы і набылі 5087 дзес. Такія поспехі былі вынікам работы земскага начальніка П. І. Бельчанкі. Ён тлумачыў сялянам сэнс заканадаўства, ім «принималось самое близкое и живое участие в заключении и окончании сделок по покупке земель частного владения» [6, арк. 33–34]. У цэлым можна меркаваць, што паспяховасць набыцця сялянамі зямлі ў поўнай ступені залежала ад дзейнасці земскага начальніка. Зразумела, што плацёжаздольнасць членаў грамады мела асноўнае значэнне. Аднак уменне даходліва растлумачыць асаблівасці заканадаўства, а таксама юрыдычныя тэрміны пры заключэнні дагавораў з Сялянскім пазямельным банкам, аўтарытэт асобы земскага начальніка таксама мелі важнае значэнне. Так, у 6-м участку Слуцкага павета з 1901 па 1914 г. змянілася пяць земскіх начальнікаў. Тут сяляне набылі 489 дзес. Адначасова ў 4-м участку ўвесь гэты час пасаду займаў У. Д. Цвеціновіч, пры якім сяляне набылі звыш 6 727 дзес. зямлі [6, арк. 45, 47, 50–50 адв.]. На большай частцы набытай зямлі ствараліся хутары ці водрубы, што спрыяла мадэрнізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці, павелічэнню яе прыбытковасці.

У адпаведнасці з указам ад 9 лістапада 1906 г. сяляне атрымалі права ўмацаваць у асабістую уласнасць сваю частку надзельнай зямлі з пераходам да хутарской ці водрубнай гаспадаркі [7, с. 970–974]. На тэрыторыі Віленскай, Гродзен-

скай і Мінскай губерняў панавала падворнае землекарыстанне, але да гэтага часу заканадаўча не быў вызначаны парадак здзяйснення здзелак аб адчужэнні ўчасткаў надзельнай зямлі, што былі ў падворным уладанні і на якія ўласнікі не мелі асобных актаў на уладанне [7, с. 970]. У Віцебскай і Магілёўскай губернях пераважала абшчыннае землекарыстанне, і менавіта на такія мясцовасці і быў у першую чаргу накіраваны названы закон.

Патрабаванні аб замацаванні ў асабістую ўласнасць часткі абшчыннай зямлі прад'яўляліся грамадзе праз сельскага старасту. На сельскім сходзе абшчыннікі простай большасцю галасоў прымалі рашэнне. У станоўчым выпадку грамада на працягу месяца павінна была адвесні ўчасткі, якія паступалі ў асабістую ўласнасць, а ў пэўных выпадках усталяваць памер даплаты за дадатковую зямлю (звыш сярэдняй нормы) і ўмовы карыстання агульнымі угоддзямі. Калі ў вызначаны тэрмін грамада не выносіла адпаведнага рашэння, то гаспадар двара мог падаць хадайніцтва земскаму начальніку, які самастойна разбіраў «па сутнасці» усе ўзнікшыя спрэчкі і абвяшчаў свае рашэнне (арт. 6) [7, с. 971].

Зацікаўленыя бакі маглі прыносіць скаргі на рашэнні сходаў і земскіх начальнікаў у павятовы з'езд земскіх начальнікаў на працягу 30 дзён. Скаргі на грамадскія прысуды падаваліся праз земскага начальніка, а ён, у сваю чаргу, прадстаўляў іх у павятовы з'езд са сваім заключэннем пасля «папярэдняга даследавання» усіх абставін справы на месцы. Абскарджаныя і неабскарджаныя грамадскія прыгаворы і пастановы земскага начальніка прадстаўляліся на зацвярджэнне павятовага з'езда, рашэнні якога лічыліся канчатковымі. Аднак і на іх можна было падаць скаргу ў губернскую прысутнасць, але толькі ў выпадку перавышэння межаў улады ці яўнага парушэння закону (арт. 9) [7, с. 971–972].

Беларускія губерні з абшчынным землекарыстаннем з самага пачатку вызначаліся сярод іншых значнымі поспехамі ў рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы. Так, да 1 лістапада 1907 г. у Віцебскай губ. было пададзена 2895 заяў аб выхадзе з абшчыны, а да 1 лістапада 1908 г. – ужо 11 953 заяў. Да 1 лістапада 1907 г. замацавалі за сабой надзелы 238 гаспадароў двароў, а да 1 лістапада 1908 г. – 7778 гаспадароў замацавалі 56 238 дзес. (па 7,23 дзес.) зямлі. У Магілёўскай губ. да 1 лістапада 1907 г. было пададзена 2227 заяў аб выхадзе з абшчыны, а да 1 лістапада 1908 г. – 30 701. На 1 лістапада 1907 г. замацавалі за сабой надзелы 10 гаспадароў двароў, а на 1 лістапада 1908 г. 20 207 гаспадароў замацавалі 164 160 дзес. (па 8,12 дзес.) зямлі [8, с. 135]. Па колькасці задаволеных заяў першынствавала Калужская губ., дзе зямля была замацавана за 76,06 % гаспадароў двароў, якія падалі заявы. Беларускія губерні адносіліся да ліку перадавых, дзе было задаволена звыш 50 % заяў: у Магілеўскай губ. – 65,82 %, у Віцебскай губ. – 65,07 % [8, с. 130, 134]. Такім чынам, мясцовыя органы кіравання ў Віцебскай і Магілёўскай губернях праводзілі значную працу па рэалізацыі аграрнай палітыкі.

Для адчужэння надзельных зямель у грамадах з падворным землекарыстаннем неабходна было атрымаць дакумент, які пацвярджаў прыналежнасць участка. Гэта маглі быць: «крепостной акт»; «владенная запись», выдадзеная сялянскімі установамі; пастановы агульнаграмадзянскіх ці валасных судоў ці павятовых з'ездаў; зацверджаныя павятовым з'ездам грамадскія прыгаворы ці пастановы земскага начальніка аб замацаванні ўчастка ў асабістую ўласнасць асобных гаспадароў двароў. Земскі начальнік зацвярджаў таксама прыгаворы сельскіх сходаў аб сапраўднай прыналежнасці ўчастка асобе ў грамадах з падворным землекарыстаннем, а ў дачыненні да сядзібных участкаў – і ў грамадах з абшчынным землекарыстаннем (аддз. II, арт. 2). У папярэднія гады ў сялян не было асаблівай неабходнасці ў масавым парадку набываць гэтыя дакументы, таму звярталіся за імі толькі ў рэдкіх выпадках. Так, у 1903 г. у Слуцкім павеце адбылося толькі 57 «вводов во владение крестьян по данным» [9, арк. 4адв.]. Такім чынам, земскі начальнік, па сутнасці, з'яўляўся першай інстанцыяй у рэалізацыі сталынінскай аграрнай рэформы. Пры гэтым, як адзначаў чыноўнік Земскага аддзела МУС К. К. Сцефановіч, на справы па ўказу ад 9 лістапада 1906 г. пры падворным землеўладанні МУС звяртаў увагу значна менш, чым на тыя, што тычыліся выхаду з абшчыны [10, арк. 13].

Менавіта на земскіх начальнікаў ускладалася задача растлумачыць сялянам сэнс законаў і карысць пераходу да хутарскога ці водрубнага землеўладання, а таксама ліквідацыі цераспалосіцы і сервітутаў. На паспяховасць іх дзейнасці ў гэтым кірунку звярталася ўвага пры правядзенні сістэматычных рэвізій неадменнымі членамі губернскай прысутнасці [11, с. 104–109]. У прыватнасці, пры рэвізіі, праведзенай пінскім павятовым прадвадзіцелем дваранства І. Папа-Афанасопула ў 2-м земскім участку Пінскага павета Мінскай губ. у 1908 г., было адзначана, што насельніцтва ўчастка да той пары «совершенно не знакомо со всеми позднейшими предначертаниями и распоряжениями, касающимися улучшения крестьянского быта». Рэвізор адзначаў, што гэтыя заканадаўчыя акты і рознага роду цыркуляры былі зусім невядомы не толькі простаму насельніцтву, але і сельскім і валасным службовым асобам [12, с. 3].

У 1908 г. у час рэвізіі Магілёускай губ. К. К. Сцефановіч адзначыў, што мясцовае насельніцтва «недостаточно осведомлено» з указам 9 лістапада 1906 г. і з выгадамі хутарскога рассялення. Умацаванне зямлі і рассяленне ў межах аднаго і таго ж павета ў адных участках ішло паспяхова, а ў другіх насельніцтва зусім не было знаёма з магчымасцю і парадкам такіх зменаў у землекарыстанні, напрыклад, у 4-м і 5-м участках Сенненскага і ў 6-м участку Гомельскага паветаў. Рэвізор звязваў такое становішча з «недастатковай энергіяй» адпаведных земскіх начальнікаў і слабым кантролем за іх дзейнасцю з боку губернскай прысутнасці [10, арк. 58].

Такім чынам, на першым этапе рэалізацыі рэформы непасрэдна удзельнічалі земскія начальнікі. Землеўладкавальныя камісіі ўяўлялі сабой галоўныя рычагі, з дапамогай якіх царскі урад меркаваў вырашыць актуальныя аграрныя пытанні. Пры гэтым вялікая падрыхтоўчая работа ускладалася менавіта на земскага начальніка. У цэлым можна казаць, што ні адна справа па землеўладкаванні не абыходзілася без актыўнага удзелу гэтых чыноўнікаў. Законам на іх ускладаўся удзел у рассяленні сялян на хутары і водрубныя участкі, распаўсюджанне палепшаных форм земляробства і г. д.

У цэлым плённасць работы мясцовых органаў кіравання сялянамі па рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы (указа ад 9 лістапада 1906 г. і закона ад 14 чэрвеня 1910 г.) у справе землеўладкавання можна вызначыць па наступных лічбавых даных.

Да 1 студзеня 1913 г. у 43 губернях Расійскай імперыі заявілі аб замацаванні надзелаў 2 422 447 гаспадароў двароў [13, арк. 7адв.], пры гэтым за 1 740 332 гаспадарамі надзел быў канчаткова замацаваны на плошчы у 12 437 426 дзес. Заявы аб выдачы засведчвальных актаў паступілі ад 259 324 гаспадароў двароў, пры гэтым патрабаванні 170 601 гаспадара на 994 934 дзес. канчаткова задаволены. Акрамя таго, паступілі патрабаванні ад 5771 сельскіх грамад з 164 168 гаспадарамі аб выдачы засведчвальных актаў на цэлыя сельскія грамады, пры чым патрабаванні 3018 грамад з 113 541 гаспадарамі на 720 402 дзес. канчаткова былі задаволены. Такім чынам, складзены і зацверджаны дакументы (засведчвальныя і замацавальныя) больш чым для двух мільёнаў гаспадароў двароў (2 024 474) на плошчы звыш 14 млн дзес. зямлі (14 152 789 дзес.) [13, арк. 8].

На тэрыторыі Беларусі ў Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях панавала падворнае землекарыстанне, а ў Вінебскай і Магілёўскай – абшчыннае. З гэтай прычыны даныя аб замацаванні зямлі ў асабістую уласнасць з 9 лістапада 1906 г. па 1 студзеня 1913 г. у звестках МУС прыведзены толькі па апошніх дзвюх. Да 1 студзеня 1913 г. тут 110 841 гаспадар двара канчаткова замацаваў 866 442 дзес. зямлі ў асабістую уласнасць, а абвясцілі патрабаванні аб умацаванні зямлі 119 253 гаспадары. Патрабаванне аб выдачы засведчавальных актаў абвясцілі 785 грамад і паселішчаў з 17 503 гаспадарамі двароў на плошчы ў 110 062 дзес. зямлі. Зацверджана было актаў для 723 грамад і паселішчаў з 15 520 гаспадарамі. Адначасова 6945 асобных гаспадароў абвясцілі патрабаванні аб выдачы ім засведчавальных актаў на плошчы 37 336 дзес., з іх зацверджана 4893 акты [13, арк. 23–23адв.]. У прыведзеныя лічбы не ўвайшлі даныя, напрыклад, па Віленскай губ. А тут, па звестках губернскай прысутнасці, земскімі начальнікамі губерні па указу 9 лістапада 1906 г. было зацверджана 4 068 засведчавальных прысудаў, а таксама 658 рашэнняў валасных судоў, якімі прызнаны былі права уласнасці за асобнымі гаспадарамі двароў на 37 790 дзес. зямлі. На падставе закону ад 14 чэрвеня 1910 г. да 1 верасня 1913 г. у Віленскай губ. земскія начальнікі зацвердзілі 4883 засведчавальныя прысуды і 282 засведчавальныя пастановы земскіх начальнікаў аб прызнанні права уласнасці на 29 771 дзес. зямлі [3, с. 8]. Такім чынам, прыведзеныя даныя сведчаць аб значным аб'ёме работ, якія даводзілася праводзіць земскім начальнікам па рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы.

Не менш характэрныя даныя аб дзейнасці мясцовых органаў у сферы землеўладкавання. Па даных МУС, колькасць земскіх начальнікаў, якія удзельнічалі ў землеўладкавальных работах, паступова узрастала. Так, у цэлым у 43 губернях Расійскай імперыі прымалі ўдзел у землеўладкаванні у 1907 г. каля 100 чал., у 1911 г. – 1216, у 1912 г. – каля 2/3 усяго складу земскіх начальнікаў, у 1913–1914 гг. гэта колькасць павялічылася [14, арк. 33]. Калі ж разглядаць больш падрабязна, то у 1911 г. з 2487 земскіх начальнікаў 1216 чал. (48,9 %) прынялі ўдзел у падрыхтоўцы землеўладкавальных справаў, а ў складанні праектаў – 609 земскіх начальнікаў. Работы на падрыхтоўцы землеўладкавальных справаў праводзіліся земскімі начальнікамі на плошчы 1485 тыс. дзес., пры гэтым у 1911 г. названымі чынамі былі завершаны работы на плошчы звыш 1 млн дзес. (1007 тыс. дзес.), г. зн. больш чым на 25 % усіх падрыхтаваных работ па ўнутрынадзельным землеўладкаванні, якія былі зроблены у названы перыяд землеўладкавальнымі камісіямі (каля 3740 тыс. дзес.) [13, арк. 8]. У якасці складальнікаў праектаў земскія начальнікі у 1911 г. выканалі работы на 496 тыс. дзес., што роўна амаль 1/6 частцы усіх завершаных і прынятых насельніцтвам у 1911 г. землеўладкавальных работ у губернях, дзе дзейнічалі землеўладкавальныя камісіі (3043 тыс.

дзес.). У 1912 г. дзейнасць земскіх начальнікаў па землеўладкаванню па колькасці прыцягнутых да справы земскіх начальнікаў і па плошчы выкананых работ павялічылася амаль на 30 % у цэлым па 43 губернях [13, арк. 8адв.].

У пяці паўночна-заходніх губернях у палявы перыяд 1911 г. земскім начальнікам была даручана першапачатковая падрыхтоўка землеўладкавальных спраў на плошчы 45 433 дзес., якая ўваходзіла ў склад 330 паселішчаў з 5050 дварамі. У рэалізацыі гэтых работ прынялі ўдзел 98 чыноўнікаў (36,2 %) з агульнай колькасці 271 чал. Найбольш актыўна ўдзельнічалі земскія начальнікі Магілёўскай губ. – 86,5 % (45 з 52 чал.) [13, арк. 25–27].

Агульнае кіраўніцтва землеўладкаваннем у Віленскай губ. ажыццяўлялася ў губернскай прысутнасці пераважна яе неадменнымі членамі. Гэтае новае кола абавязкаў значна ўскладніла дзейнасць апошніх, таму ў 1908 г. для выканання абавязкаў неадменнага члена прысутнасці па справах землеўладкавання быў прызначаны чыноўнік асобных даручэнняў Галоўнага упраўлення землеўладкавання і земляробства. З гэтага часу землеўладкавальнае справаводства было выдзелена ў асобнае, а пасля выдання закону ад 29 мая 1911 г. былі адкрыты Віленская і Гродзенская губернскія землеўладкавальныя камісіі [3, с. 25]. Да гэтага часу функцыі губернскіх землеўладкавальных камісій тут выконвалі губернскія прысутнасці [4, с. 11].

З адкрыццём землеўладкавальных камісій дзейнасць земскіх начальнікаў набыла больш азначаную форму, але ўлічыць усе іх намаганні ў канкрэтных лічбах не ўяўляецца магчымым. У прыватнасці, у дзейнасці земскіх начальнікаў у гэтым кірунку можна вызначыць два бакі. Па-першае, гэта тыя дзеянні, якія выконваліся ўсімі названымі чыноўнікамі ў якасці прамых абавязкаў па пасадзе: засведчанне прысудаў, збіранне ўладальнікаў у парадку арт. 67 «Положения о землеустройстве» і ўдзел у рабоце землеўладкавальнай камісіі па справах свайго ўчастка. З другога боку, можна вызначыць іх дзейнасць як членаў землеўладкавальных камісій – гэта даручэнне ім падрыхтоўкі спраў і выкананне апошніх у якасці землеўладкавальніка. Гэты бок дзейнасці земскіх начальнікаў мае важнае значэнне для характарыстыкі іх удзелу ў рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы, таму што справы такога кшталту ўскладаліся пераважна на тых земскіх начальнікаў, якія праявілі выключную ініцыятыву ці асабістую зацікаўленасць да справы.

У адпаведнасці з планам Віленскай губ. на 1908 г. земскім начальнікам было даручана кіраўніцтва ўнутрынадзельным землеўладкаваннем на плошчы ў 2028 дзес., ці 6,4% агульнай плошчы, вызначанай для землеўладкавання. У 1910 г. на іх было ўскладзена кіраўніцтва работамі на плошчы ў 3161 дзес. (7,7 % агульнай плошчы землеўладкавальных работ), у 1911 г. – 3040 дзес. (7,4 %), у 1912 г. – 5000 дзес., ці 18,4 %, у 1913 г. – 6060 дзес. (22,4 %) [3, с. 25–26].

У Гродзенскай губ. у 1913 г. падрыхтоўку землеўладкавання ажыццяўлялі 42 земскія начальнікі, якім была даручана 201 справа. Па іх уладкаванне праводзілася ў 232 паселішчах з 11 219 дварамі на плошчы ў 81 461,1 дзес. Усяго ж у гэтых паселішчах было 12 164 двары з плошчай зямлі ў 98 122 дзес. Такім чынам, у 232 паселішчах землеўладкаваннем было ахоплена 92,2 % двароў на 83,0 % агульнай плошчы. Калі ж весці размову толькі пра 6 беларускіх паветаў губерні, то тут было задзейнічана 36 земскіх начальнікаў, якім даручалася 174 справы (86,6 % ад усёй колькасці па губерні) [14, арк. 19–20адв.].

Гродзенскі губернатар В. М. Шабека ў цыркуляры да земскіх начальнікаў губерні ад 31 студзеня 1914 г. адзначаў, што не ўсе земскія начальнікі выконвалі патрабаванні, якія да іх прад'яўляў урад у землеўладкавальнай справе. Напрыклад, у Кобрынскім павеце сялянскае насельніцтва прыняло ўсю карысць пераходу да водрубнага і хутарскога землекарыстання. Тут землеўладкавальным працам спрыялі этнаграфічныя ўмовы і тапаграфічнае становішча мясцовасці, звычка палескіх сялян да аднаселляў, а роўныя балоціста-чарназёмныя або балоціста-суглінкавыя прасторы пры аднолькавай якасці ўгоддзяў палягчалі працы землеўладкавальнікаў. Амаль у такіх жа ўмовах знаходзілася ўсё Палессе, а менавіта паўднёвая частка Пружанскага і Слонімскага паветаў. Аднак, як адзначаў губернатар, не ва ўсіх земскіх участках нават Кобрынскага павета работы ішлі паспяхова. Напрыклад, у 2-м участку на працягу 1913 г. ні адна вёска не была разверстана на хутары або водрубы. Губернатар лічыў, што землі аднолькавай якасці, як, напрыклад, у Сабалянскай, Гожскай і іншых валасцях Гродзенскага павета, дзе пераважалі пяскі, а надзелы даходзілі да 100 дзес. на сям'ю, і землі паўднёвай часткі Ваўкавыскага павета і іншых раёнаў губерні, давалі шырокае поле для землеўладкавальных прац. Ён адзначаў неабходнасць і эфектыўнасць тлумачэння сялянам карысці пераходу ад шнуравога землекарыстання да асобных адрубных гаспадарак, пры якіх магчыма прымяненне новых прыёмаў гаспадаркі, пераходу да травасеяння, агародніцтва, садоўніцтва, паляпшэння жывелагадоўлі і г. д. На думку губернатара,

непараўнальна горшых умовах знаходзіліся ыя паветы, дзе розная якасць глебы, раздроленасць надзельных участкаў пасля сямейых падзелаў і адсутнасць пашаў ускладнялі аботы землеўладкавальнікаў. Але і тут работы былі выкананы ва ўсіх паветах Гродзенскай уб. В. М. Шабека заклікаў земскіх начальнікаў жыць увесь свой уплыў на сялянскае насельіцтва даручаных ім участкаў і звярнуць асалівую ўвагу на землеўладкавальныя справы, ырашаць іх у першую чаргу, таму што яны мелі сабліва важнае значэнне [14, арк. 17–17адв.].

Земскія начальнікі Магілёўскай губ. шырока рыцягваліся не толькі да падрыхтоўкі, але і да епасрэднай рэалізацыі землеўладкавання. Так, 1914 г. 35 земскіх начальнікаў атрымалі 64 заанні на землеўладкаванне 341 зямельнай адзінкі а 23 090 дзес. зямлі для 2045 двароў. Гэта склала 4,3 % ад усёй плошчы землеўладкавання ў гуэрні (94 929 дзес.) [15, арк. 28адв. – 29.].

Пры ўсіх гэтых значных лічбах, якія характэрызуюць удзел земскіх начальнікаў у рэаліацыі сталынінскай аграрнай рэформы, існаваў шчэ прастор і патэнцыял для іх працы у гэтай феры. У прыватнасці, гродзенскі губернатар . М. Шабека адзначаў у 1914 г., што ўдзел емскіх начальнікаў губерні ў землеўладкаанні «крайне недостаточный». Ён тлумачыў акое становішча недаверам да іх здольнасцей боку неадменных членаў землеўладкавальных амісій, а таксама «ведомственным стремленим инов Главного управления землеустройства о возможности удержать это огромной важнои дело в своих руках». Губернатар лічыў неходнай для паспяховай рэалізацыі ўрадавай алітыкі сумесную працу неадменных членаў землеўладкавальных камісіи з земскімі начальнікамі [14, арк. 77–77адв.].

У 1907 г. міністр унутраных спраў П. А. Сталыпін вызначыў месца і ролю губернскіх прысутнасцей і іх неадменных членаў у мясцовым кіраванні і ў рэалізацыі аграрнай палітыкі дзяржавы: «Губернския присутствия – это нервный центр губернии, объединяющий все власти, близко соприкасающиеся с крестьянами» [16, с. 4]. Другі міністр унутраных спраў, М. А. Маклакоў, у 1912 г. назваў неадменных членаў прысутнасцей «ближайшими руководителями и непосредственными инструкторами», праз якіх прысутнасць, як орган назірання, ажыццяўляла кантроль, кіраўніцтва і каардынацыю дзейнасці падпарадкаваных ёй устаноў і асоб у адпаведнасці з патрабаваннямі урадавай палітыкі. Гэтыя ўмовы прывялі да таго, што ў пачатку XX ст. неадменныя члены прысутнасці з'яуляліся «фактически главными направляющими силами в областях – общественного управления крестьянского населения, местного правосудия, обеспечения населения продовольствием и, наконец, главное, в деле проведения в жизнь новейших узаконений в сфере крестьянского землевладения» [17, арк. 3адв.].

Такім чынам, мясцовыя органы кіравання – губернскія прысутнасці, земскія начальнікі і іх павятовыя з'езды – адыгрывалі значную ролю ў рэалізацыі Сталыпінскай аграрнай рэформы, прымаючы ў ёй непасрэдны ўдзел. Ад таго, наколькі своечасова і дакладна яны інфармавалі мясцовае насельніцтва, тлумачылі сэнс заканадаўчых актаў і цыркуляраў, залежала актыўнасць сялян у набыцці зямлі ў прыватную ўласнасць ці яе арэндзе, пераходзе да хутароў і адрубоў, выкарыстанні і ўкараненні новых спосабаў вядзення гаспадаркі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Полное собрание законов Российской империи (далее – ПСЗРИ). – Собр. 3-е. – Т. 26 (1906). – Отд. 1. – 27478. – С. 199–201.
2. *Ліпінскі, Л. П.* Сталыпінская аграрная рэформа на Беларусі. Разбурэнне абшчыннага землеўладання / П. Ліпінскі, А. Р. Бухавец // Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён: у 3 т. – Мінск: эларус. навука, 2002. – Т. 2: Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. / З. Е. Абезгауз інш.]; пад рэд. В. П. Панюціча. – 552 с.
3. Навукова-даведачная бібліятэка Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва. Друкаваная запіска № 14926. раткий обзор десятилетней деятельности крестьянских учреждений Виленской губернии, преобразованных по кону 12 июля 1889 года (1 декабря 1903 – 1 декабря 1913) / сост. Виленским губернским присутствием. – Вильа: Губерн. тип., 1913. – 37 с.
4. Краткий очерк за десятилетие: 1906–1916 / Комитет по землеустроительным делам. – Петроград: Т-во Годике и А. Вильборг, 1916. – 62, VII, [10] с., [15] л.
5. Обзор Минской губернии за 1913 год / Издание Минского губернского статистического комитета. – Минск, 14. – [3], 72, [53] с.
6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску (далей – НГАБ у Мінску). – Ф. 1595. – Воп. 1. – Спр. 85.
7. ПСЗРИ. – Собр. 3-е. – Т. 26(1906). – Отд. 1. – № 28528. – С. 970–974.
8. Приложения к трудам съезда непременных членов губернских присутствий и землеустроительных комисй. 10–23 янв. 1909 г. / Министерство внутренних дел. – СПб.: Тип. М-ва внутренних дел, 1909. – Стр. VI+ с.
9. НГАБ у Мінску. – Ф. 1595. – Воп. 1. – Спр. 323.

10. Расійскі дзяржауны гістарычны архіу (далей – РДГА). – Ф. 1291. – Воп. 31, 1908. – Спр. 6.

11. Съезд непременных членов губернских присутствий. Труды Съезда непременных членов губернских присутствий и землеустроительных комиссий. 10–23 янв. 1909 г. / М-во внутренних дел. – СПб.: Тип. М-ва внутренних дел, 1909. – [6], XVIII, 363 с.

12. Акт ревизии, произведенной Пинским уездным предводителем дворянства И. А. Папа-Афанасопуло во втором земском участке Пинского уезда 5–7 и 16, 17, 26, 27 авг. 1908 года. – [Минск: Губерн. тип., 1908]. – 65, [2] с.: табл.

13. РДГА. – Ф. 1278. – Воп. 6. – Спр. 456.

14. Нацыянальны гістарычны архіу Беларусі у Гродна (далей – НГАБ у Гродна). – Ф. 18. – Воп. 1. – Спр. 1797.

15. НГАБ у Мінску. – Ф. 1595. – Воп. 1. – Спр. 3350.

16. Съезд непременных членов губернских присутствий. Труды Съезда непременных членов губернских присутствий. 24 окт. – 1 нояб. 1907 г. / М-во внутренних дел. – СПб.: Тип. М-ва внутренних дел, 1908. – [4], 155 с.

17. РДГА. – Ф. 1278. – Воп. 2. – Спр. 2057.

**Дата паступлення: 30.09.2018.**